

*Галіна Дамарацкая*
*загадчыца аддзела радыё раённай газеты "Савецкае Палессе"*

У дзяцінстве, а пазней і на парозе сталасці нават і ў думках не было пра тое, што сваёй прафесіяй выберу журналістыку. Увесь час уяўляла сябе настаўніцай. Любімым прадметам была геаграфія. Урокі, якія выкладаў Іосіф Нікіфаравіч Новік, кожны раз былі для мяне накшталт нязведаных таямніц. Неаднойчы бачыла сябе ў снах, калі з указкай у руках стаю каля карты і тлумачу рабятам, так як мой любімы настаўнік, новую тэму ўрока. Але гэтаму не суджана было збыцца. Пры паступленні ў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна не хапіла прахаднога бала.

Працаўладкавацца ў сярэдзіне 60-х было таксама нялёгка. Але ж, як кажуць, свет не без добрых людзей. Сакратар райкома партыі І.Д. Балкін звёў тады з Васілём Фёдаравічам Праскуравым, які якраз падбіраў штат для будучай "раёнкі". На час нашага знаёмства свабоднай вакансіяй засталася пасада дыктара раённага радыё. Паслухаўшы чытанне розных па жанру матэрыялаў, Васіль Фёдаравіч даў "дабро". Так з 1 студзеня 1967 года я пачала працаваць, афіцыйна атрымліваць зарплату. Была яна на першым часе невялікая, усяго 40 рублёў. Плюс да гэтай сумы атрымлівала рублёў 10 –15 ганарару за заметкі, якія друкаваліся ў "раёнцы".

Мой першы матэрыял, які надрукаваны ў першым нумары “Савецкае Палессе” была замалёўка “Іскрыстая радасць”. Атрымаўшы заданне напісаць пра каваля калгаса “Праўда” Іосіфа Валецкага, думала, што справілася паспяхова. Думала так я, але не рэдактар. Васіль Фёдаравіч пасадзіў мяне побач з сабой і пачаў тлумачыць, як гэта робіцца. Урэшце разам, як часта ён любіў паўтараць, прывялі на божы лад аповяд пра каваля, даўшы загаловак “Іскрыстая радасць”. Той першы ўрок , які выклаў тады Васіль Фёдаравіч, застаўся ў памяці на ўсё жыццё.

Вядома ж, падобныя разборкі былі і пазней, але ж галоўнае тое, што, не лічачыся з часам, рэдактар свой багаты вопыт, любоў да сваёй прафесіі, стараўся перадаваць нам, маладым. Гэта толькі Васіль Фёдаравіч змог пераканаць, што прафесія журналіста нічым не горшая за прафесію настаўніка ( рыхтавалася зноў паступаць на геафак педінстытута). Таму ўступныя экзамены на завочнае аддзяленне прыйшлося здаваць на журфак Белдзяржуніверсітэта. Працавала і завочна вучылася, на працягу шасці гадоў. Было нялегка, але ж, вяртаючыся з сесіі, адразу з заліковай кніжкай, як гэтага патрабаваў рэдактар, ішла перад ім трымаць справаздачу.

Жыццё пражыць - не поле перайсці. Так гаворыць народная мудрасць. Кожны пражыты дзень не падобны на мінулы, не ведаеш, што чакае і заўтра. Здаралася усё - і радасці, і засмучэнні, але Васіль Фёдаравіч заўсёды быў у курсе. Падтымліваў, дапамагаў і словам, і справай - уладкоўваў нашых дзяцей у садзікі (на той час была праблема нумар адзін), дзякуючы менавіта яму атрымлівалі добраўпарадкаваныя кватэры…

Адным словам, гэты чалавек пакінуў у душы аб сабе самы цёплы ўспамін, які застанецца на ўсё жыццё.